Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Аб’ект аўтарскага права
УДК 37.017.4-057.87:[728.48:338.467.6](476)(043.3)

**ШЫК**
**Кірыл Іванавіч**

# ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ НАВУЧЭНСКАЙ МОЛАДЗІ Ў КЛУБНЫХ УСТАНОВАХ СРОДКАМІ СВЯТОЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Аўтарэферат
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата педагагічных навук
па спецыяльнасці 13.00.05 – тэорыя, методыка і арганізацыя
сацыяльна-культурнай дзейнасці

Мінск, 2025

Навуковая работа выканана ва ўстанове адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**Навуковы кіраўнік** **Наумчык Віктар Мікалаевіч**,
доктар педагагічных навук, прафесар, загадчык кафедры агульнай і прафесійнай педагогікі ўстановы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут прафесійнай адукацыі»

**Афіцыйныя апаненты:** **Малахава Ірына Аляксандраўна**,
доктар педагагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры псіхалогіі і педагогікі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**Леснічэнка-Рагоўская Марыя Уладзіміраўна,**
кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры маркетынга дзяржаўнай установы адукацыі «Інстытут бізнесу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта»

**Апаніруючая арганізацыя** Установа адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава»

Абарона адбудзецца «9» кастрычніка 2025 г. у 10.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый К 09.03.01 пры ўстанове адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»: 220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17, чытальная зала бібліятэкі, e-mail: buk@buk.by; тэлефон вучонага сакратара: (017) 255-53-07.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».

Аўтарэферат разасланы «9» верасня 2025 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый Ю. М. Галкоўская

# УВОДЗІНЫ

Пошук новых падыходаў да патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі – актуальны напрамак педагагічнай работы, які адпавядае дзяржаўнай ідэалогіі і з’яўляецца адным з фактараў забеспячэння ўстойлівага развіцця і ўмацавання нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.

У педагагічнай навуцы і практыцы дастаткова поўна і глыбока раскрыты прынцыпы, формы і метады патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў розных установах адукацыі. Пры гэтым аналіз работ, прысвечаных праблемам патрыятычнага выхавання, паказвае, што ў сферу навуковага пошуку амаль не трапляюць даследаванні, накіраваныя на патрыятычнае выхаванне навучэнскай моладзі ў клубных установах. Відавочная недастатковасць распрацаванасці гэтага працэсу абумовіла зварот да святочнай дзейнасці, якая займае цэнтральнае месца ў клубнай рабоце і ўключае ў сябе гульнявую, культурна-рэкрэацыйную, інфармацыйна-адукацыйную, абрадавую і іншыя сацыяльна-культурныя формы.

Спецыяльна арганізаваная патрыятычна накіраваная святочная дзейнасць з яе педагагічным патэнцыялам, комплексным характарам, самадзейнай прыродай, калектыўным, добраахвотным удзелам, свабодай самавыяўлення, самасцвярджэння, асаблівымі міжасобаснымі камунікацыямі і канструктыўна-дзейнаснымі зносінамі з’яўляецца эфектыўным сродкам выхавання, спрые развіццю ў навучэнскай моладзі пачуцця асабістай і нацыянальнай годнасці, выяўленню і замацаванню патрыятычных каштоўнасцей, усведамленню імі сваёй ролі ў жыцці краіны.

У той жа час у айчыннай педагогіцы сацыяльна-культурнай дзейнасці амаль не сустракаюцца навукова абгрунтаваныя комплексныя даследаванні святочнай дзейнасці як сродку патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў клубных установах.

Падчас вывучэння пазначанай праблемы былі выяўлены супярэчнасці, якія вызначаюць актуальнасць тэмы патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў клубных установах сродкамі святочнай дзейнасці:

– паміж высокай значнасцю працэсу патрыятычнага выхавання для дзяржавы і грамадства і недастатковай сістэмнай арганізацыяй гэтага працэсу для навучэнскай моладзі ў іх вольны час;

– паміж наяўнасцю багатага выхаваўчага патэнцыялу святочнай дзейнасці і недастатковым яго выкарыстаннем клубнымі ўстановамі ў патрыятычным выхаванні навучэнскай моладзі;

– паміж патрэбай клубных устаноў у навукова абгрунтаваных рэкамендацыях выкарыстання сродкаў святочнай дзейнасці ў патрыятычным выхаванні навучэнскай моладзі і недастатковай распрацаванасцю метадычнага забеспячэння гэтага працэсу.

Пазначаныя супярэчнасці сведчаць аб тым, што патрыятычнае выхаванне навучэнскай моладзі ў клубных установах сродкамі святочнай дзейнасці патрабуе грунтоўнага аналізу, стварэння мадэлі і методыкі, якія б дазволілі істотна павысіць эфектыўнасць гэтага працэсу.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі**

Тэма дысертацыйнай работы адпавядае прыярытэтным напрамкам навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці на 2021–2025 гады (п. 6 «Забеспячэнне бяспекі чалавека, грамадства і дзяржавы»), зацверджаным Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 07.05.2020 № 156; Дзяржаўнай праграме «Культура Беларусі» на 2021–2025 гады (падпраграма 1 «Культурная спадчына», падпраграма 2 «Мастацтва і творчасць»), зацверджанай пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 29.01.2021 № 53; Дзяржаўнай праграме «Адукацыя і маладзёжная палітыка» на 2021–2025 гады (падпраграма 10 «Маладзёжная палітыка»), зацверджанай пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 29.01.2021 № 57; Праграме патрыятычнага выхавання насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2022–2025 гады, зацверджанай пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 29.12.2021 № 773.

Дысертацыя выканана ў межах комплексных навуковых тэм кафедры педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці і кафедры рэжысуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»: «Педагагічнае мадэляванне культурна-адпачынкавай дзейнасці дзяцей і моладзі» на 2021–2025 гады (пратакол вучонага савета ўніверсітэта ад 17.12.2021 № 4); «Тэатральнае мастацтва і відовішчная культура: традыцыі і навацыі» (пратакол вучонага савета ўніверсітэта ад 17.12.2021 № 4).

**Мэта, задачы, аб’ект і прадмет даследавання**

Мэта даследавання – тэарэтычнае абгрунтаванне, распрацоўка і апрабацыя педагагічнай мадэлі і методыкі патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў клубных установах сродкамі святочнай дзейнасці.

Акрэсленая мэта даследавання абумоўлівае вырашэнне наступных задач:

– удакладніць змест паняцця «патрыятычнае выхаванне навучэнскай моладзі» ў сацыякультурным кантэксце, выявіць яго кампанентную структуру і сутнасныя характарыстыкі;

– раскрыць сутнасць і педагагічны патэнцыял святочнай дзейнасці як сродку патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў клубных установах;

– стварыць педагагічную мадэль патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў клубных установах сродкамі святочнай дзейнасці;

– распрацаваць і эксперыментальна апрабіраваць методыку патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў клубных установах сродкамі святочнай дзейнасці.

*Аб’ект даследавання* – патрыятычнае выхаванне навучэнскай моладзі ў клубных установах.

*Прадмет даследавання* – мадэль і методыка патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі сродкамі святочнай дзейнасці.

**Навуковая навізна**

Упершыню ў айчыннай тэорыі, методыцы і арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці комплексна абгрунтаваны працэс патрыятычнага выхавання навучэнскай

моладзі ў клубных установах сродкамі святочнай дзейнасці. У сацыякультурным кантэксце ўдакладнены змест паняцця «патрыятычнае выхаванне навучэнскай моладзі», выяўлены яго сутнасная характарыстыка і кампанентная структура; раскрыты сутнасць і педагагічны патэнцыял святочнай дзейнасці як сродку патрыятычнага выхавання ў клубных установах; распрацаваны і эксперыментальна апрабіраваны мадэль і методыка патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў клубных установах сродкамі святочнай дзейнасці; вызначаны арганізацыйна-педагагічныя ўмовы, якія садзейнічаюць эфектыўнай рэалізацыі мадэлі і методыкі патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў клубных установах сродкамі святочнай дзейнасці.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Патрыятычнае выхаванне навучэнскай моладзі як сацыякультурная з'ява – гэта сістэматычны, мэтанакіраваны, кантралюемы працэс узаемадзеяння выхавацеляў і выхаванцаў у розных відах сацыяльна-культурнай дзейнасці, які прадугледжвае развіццё свядомасці (веданне айчыннай гісторыі, асэнсаванне традыцый нацыянальнай культуры, разуменне асноў ідэалогіі беларускай дзяржавы), пачуццяў (любоў да Радзімы, гонар і павага за найбольш значныя дасягненні дзяржавы, грамадства, суайчыннікаў), перакананняў (гатоўнасць да ўмацавання дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, абароны Айчыны). Структурнымі кампанентамі патрыятычнага выхавання з'яўляюцца: *эмацыйна-каштоўнасны,* адлюстроўвае погляды і перакананні, вызначае пачуцці, стаўленне навучэнскай моладзі да Радзімы; *кагнітыўны,* уяўляе сабой сукупнасць ведаў, тэорый, ідэй, канцэпцый, звязаных з разуменнем навучэнскай моладдзю сутнасці патрыятызму, вывучэннем гісторыі бедарускай дзяржаўнасці, яе нацыянальнай культуры; *матывацыйна-дзейнасны*, вызначае патрыятычныя запатрабаванні навучэнскай моладзі, што выяўляюцца ў паводзінах накіраваных на росквіт і дабрабыт дзяржавы, яе абарону.

2. Святочная дзейнасць – гэта сацыякультурны, шматгранны творчы працэс, накіраваны на дасягненне пэўных выхаваўчых, эстэтычных, маральных, адпачынкавых і іншых мэт, увасобленых арганізатарамі ў форме ўрачыстасці або сукупнасці звычаяў, абрадава-рытуальных, відовішчных ці масава-гульнявых дзей, у якіх могуць спалучацца розныя віды і жанры мастацтва.

*Педагагічны патэнцыял святочнай дзейнасці ў структуры патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі вызначаецца:*

– сацыякультурным асяроддзем, у якім ствараюцца спрыяльныя магчымасці для рознабаковага і гарманічнага развіцця і самавыяўлення навучэнскай моладзі, што стымулюе і актывізуе іх творчую дзейнасць, паглыбляе характар успрымання інфармацыі, служыць сродкам духоўна-маральнага і эстэтычнага ўзбагачэння;

– калектыўным узаемадзеяннем, калі кожнаму ўдзельніку ў працэсе падрыхтоўкі і правядзення святаў прадстаўляюцца неабмежаваныя магчымасці самасцвярджэння ў адной або некалькіх відах грамадскай дзейнасці і сацыяльна значнай творчасці;

– асаблівым эмацыйным суперажываннем. Інтэнсіўнасць суперажывання да падзей на сцэнічнай пляцоўцы найбольш моцная ў непасрэдных удзельнікаў,

арганізатараў свята, што спараджае не толькі эмацыйнае дзеянне, але і інтэлектуальнае асэнсаванне;

– гістарычнай памяццю, святы захоўваюць і перадаюць традыцыі дзяржавы і грамадства, транслююць культурныя каштоўнасці беларускага народа. Іх удзельнікі знаёмяцца, вывучаюць адпаведную літаратуру, народную спадчыну, што спрыяе актыўнаму выкарыстанню захаваных каштоўнасцей Радзімы.

3. Педагагічная мадэль патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў клубных установах сродкамі святочнай дзейнасці складаецца з наступных узаемазвязаных і ўзаемаабумоўленых блокаў: мэтавага, у якім прадстаўлены канцэптуальныя асновы патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі сродкамі святочнай дзейнасці (мэта, структурныя кампаненты, падыходы); змястоўна-тэхналагічнага, у якім адлюстраваны прынцыпы, напрамкі, формы, метады, этапы святочнай дзейнасці, што дазваляе атрымаць веды, уменні, сфарміраваць патрыятычную свядомасць, актывізаваць пазнавальную і рэфлексіўную дзейнасць (працэс патрыятычнага выхавання здзяйсняецца праз арганізацыю і ўдзел у дзяржаўных, фальклорных, гістарычных, мастацкіх, экалагічных, спартыўных святах, накіраваных на захаванне і папулярызацыю гісторыі, традыцый, ідэалогіі беларускай дзяржавы); крытэрыяльна-дыягнастычнага, дзе пазначаны узроўні (высокі, сярэдні, нізкі), крытэрыі і адпаведныя паказчыкі да іх, рэфлексія; выніковага, у якім адлюстраваны вынік спецыяльна арганізаванага педагагічнага ўздзеяння з мэтай вызначэння якасных змен у працэсе патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі. Паказчыкам станоўчых змен з’яўляецца патрыятычная выхаванасць, якая праяўляецца ў канкрэтных дзеяннях на карысць Радзімы: добрасумленнае стаўленне да працы, праз актыўную практычную дзейнасць павышэнне дабрабыту краіны, выкананне вайсковага абавязку, захаванне і перадача традыцыйных каштоўнасцей, павага да дзяржаўных сімвалаў Рэспублікі Беларусь, актыўны ўдзел у выбарчых кампаніях.

Мадэль патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў клубных установах сродкамі святочнай дзейнасці ўяўляе сабой адзінства структурных блокаў (мэтавага, змястоўна-тэхналагічнага, крытэрыяльна-дыягнастычнага, выніковага), якія дазваляюць сфарміраваць эмацыйна-каштоўнасны, кагнітыўны, матывацыйна-дзейнасны кампаненты патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі.

4. Методыка патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў клубных установах сродкамі святочнай дзейнасці ўключае шэраг этапаў, кожны з якіх прадугледжвае дасягненне прыватных мэт на аснове зместу, форм і метадаў работы спецыялістаў сацыяльна-культурнай сферы. Падрыхтоўчы этап вызначае мэту і задачы, рэсурсную і метадычную базу, прадугледжвае першасную дыягностыку; матывуе ўдзельнікаў да пошукавай, інтэлектуальнай дзейнасці праз правядзенне лекцый, экскурсій, адкрытых дыялогаў па адпаведным сваце; актывізуе самастойную дзейнасць у працэсе падрыхтоўкі да свята. Арганізацыйны этап абапіраецца на веды навучэнскай моладзі, атрыманыя на папярэднім этапе; садзейнічае развіццю аналітычнага мыслення, асэнсаванню матэрыялу; выпрацоўвае здольнасць

навучэнскай моладзі падчас арганізацыі святаў атрымліваць асалоду ад творчай актыўнасці і патрэбы ў грамадска-карысных справах (адбор матэрыялу, напісанне сцэнарыяў, рэпетыцыі). Асноўны этап уключае пастаноўку і правядзенне свята, стварэнне перадсвяточнай атмасферы, адлюстроўвае патрыятычныя пачуцці і перажыванні. Рэфлексіўны этап (актуалізуе патрэбу ў асэнсаванні удзелу ў святочнай дзейнасці, дазваляе ўсвядоміць атрыманыя веды, інтэрыярызаваць патрыятычныя каштоўнасці).

Эфектыўнасць методыкі патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў клубных установах сродкамі святочнай дзейнасці забяспечваецца наступнымі арганізацыйна-педагагічнымі ўмовамі:

– аб'яднанне навучэнскай моладзі і спецыялістаў сацыяльна-культурнай сферы ў творчую групу па арганізацыі святочнай дзейнасці з улікам узроставa-індывідуальных асаблівасцей першых;

– стварэнне сацыяльна-культурнага асяроддзя сродкамі святочнай дзейнасці для рэалізацыі навучэнскай моладдзю сваёй суб'ектнай пазіцыі;

– выкарыстанне метадаў тэатралізацыі, дэманстрацыі, гульні, вуснага, друкаванага і інфармацыйнага ўздзеяння, сучасных і традыцыйных формаў святочнай дзейнасці, накіраваных на павышэнне ўзроўню патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі.

**Асабісты ўклад саіскальніка вучонай ступені**

Дысертацыйнае даследаванне з'яўляецца самастойна выкананай навуковай работай, у межах якой: 1) удакладнены змест паняцця «патрыятычнае выхаванне навучэнскай моладзі» ў сацыякультурным кантэксце і выяўлена яго кампанентная структура; 2) раскрыты сутнасць і педагагічны патэнцыял святочнай дзейнасці, як сродку патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў клубных установах; 3) распрацавана і эксперыментальна апрабіраваны мадэль і методыка патрыятычнага выхавання сродкамі святочнай дзейнасці для навучэнскай моладзі; 5) выяўлены і абгрунтаваны арганізацыйна-педагагічныя ўмовы, якія спрыяюць эфектыўнасці працэсу патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі.

**Апрабацыя дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў**

Матэрыялы даследавання прадстаўлены на 26 міжнародных, рэспубліканскіх навуковых, навукова-практычных, навукова-метадычных канферэнцыях: «Проблемы и перспективы развития образования» (Пермь, 2012), «Психология и педагогика в системе гуманитарного знания» (Масква, 2012), «International conference on European Science and Technology» (Мюнхен, 2012), «Сучасны культурны працэс: праблемы, перспектывы, метады даследавання» (Мінск, 2012), «Культура – открытый формат» (Мінск, 2012), «Беларуская нацыянальная культура і асоба» (Мінск, 2013), «Христианские ценности в культуре современной молодежи» (Мінск, 2013), «Общество, культура, личность. Актуальные проблемы социально-гуманитарного знания» (Прага, 2013), «Навуковы пошук у сферы культуры і мастацтва» (Мінск, 2013), «Культура – открытый формат» (Мінск, 2013), «Личность в контексте современных социокультурных процессов» (Мінск, 2014), «Культура – открытый

фармат» (Мінск, 2014), «Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні» (Мінск, 2014), «Культура – открытый формат» (Мінск, 2015), «Культура. Навука. Творчасць» (Мінск, 2015), «Нацыянальная культура вачыма маладых» (Мінск, 2015), «Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні» (Мінск, 2015, 2016), «Культура – открытый формат» (Мінск, 2016), «Навуковы пошук у сферы сучаснай культуры і мастацтва» (Мінск, 2017, 2022, 2023), «Культура – открытый формат» (Мінск, 2021), «Проблемы и перспективы развития высшего образования в сфере культуры и искусств» (Мінск, 2022), «Навуковы пошук у сферы сучаснай культуры і мастацтва» (Мінск, 2022, 2023).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыйнага даследавання адлюстраваны ў 22 навуковых публікацыях: 5 артыкулаў у навуковых рэцэнзуемых выданнях (1,7 аўт. а.); 8 артыкулаў у навуковых зборніках (1,9 аўт. а.); 8 артыкулаў у зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый (2,15 аўт. а.); 1 артыкул у навукова-папулярным выданні (0,35).

Агульны аб'ём апублікаваных работ складае 6,1 аўтарскіх аркушаў.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, асноўнай часткі, якая змяшчае дзве главы, заключэнне, спіс выкарастаных крыніц, дадаткі. Поўны аб'ём дысертацыі складае 212 старонак, з іх: 108 старонак займае асноўны тэкст (у тым ліку 20 старонак утрымліваюць – табліцы і ілюстрацыі), 22 старонкі – бібліяграфічны спіс, які ўключае 230 найменняў на беларускай і рускай мовах і 22 публікацыі аўтара на беларускай, рускай, англійскай мовах, 82 старонкі займаюць дадаткі. У дысертацыйнай рабоце прадстаўлены 27 табліц (12 – у асноўным тэксце, 15 – у дадатках) і 10 малюнкаў (9 – у асноўным тэксце, 1 – у дадатках).

## АСНОЎНАЯ ЧАСТКА

*У першай главе «Тэарэтыка-метадалагічныя асновы патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў клубных установах сродкамі святочнай дзейнасці»* раскрываюцца гістарычныя і сацыяльныя вытокі праблемы даследавання, погляды вучоных, шляхі і сродкі рэалізацыі патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі на розных гістарычных этапах, абгрунтоўваюцца тэарэтычныя асновы і метады даследавання, вызначаецца педагагічны патэнцыял святочнай дзейнасці ў выхаваўчай прасторы клубных устанаў, апісваецца педагагічная мадэль.

*У раздзеле 1.1 «Паняцце, змест і кампанентная структура патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі»* прааналізавана філасофская, культуралагічная, псіхолага-педагагічная і іншая літаратура па праблеме даследавання і вызначана ступень распрацаванасці тэмы.

Аналіз навуковай літаратуры сведчыць, што ідэя патрыятызму заўсёды была ў цэнтры ўвагі філосафаў, сацыёлагаў, культуролагаў, псіхолагаў, педагогаў, грамадскіх і дзяржаўных дзеячаў, што адлюстроўвае яе значнасць у станаўленні асобы патрыёта і

грамадзяніна. Першыя згадкі пра стаўленне грамадзян да Айчыны можна знайсці ў працах старажытнагрэчаскіх філосафаў Арыстоцеля, Дэмакрыта і Платона.

Выхаванне грамадзяніна-патрыёта апісана ў навуковых працах найбольш аўтарытэтных філосафаў XVIII–XIX стст.: Г. В. Гегеля, І. Ф. Гербарта, Д. Дзідро, І. Г. Песталоцы і інш.

Ідэя выхавання любові да Радзімы знайшла адлюстраванне і ў працах найбольш яскравых рускіх мысліцеляў XVIII–XX стст. Д. С. Анічкава, А. А. Барсава, В. Р. Бялінскага, А. І. Герцэна, М. В. Ламаносава, Л. М. Талстога і інш.

Важна адзначыць, што мінулае нашай Радзімы пераканаўча сведчыць пра вялікую ролю патрыятычных ідэй у пабудове дзяржавы. Пра гэта яшчэ ў XVI–XVII стст. у сваіх працах выказаліся С. Будны, М. Гусоўскі, С. Полацкі, Ф. Скарына, В. Цяпінскі. Шырока асэнсавана айчынная патрыятычная думка ў спадчыне І. Абдзіраловіча, М. Бурачка, Я. Коласа, Я. Купалы, Цёткі і інш.

Для разумення структуры патрыятычнага выхавання ў нашым даследаванні, былі прааналізаваны работы педагогаў савецкага перыяду: А. А. Аронава, М. А. Арыярскага, Н. Г. Базілевіч, Н. К. Крупскай, А. С. Макаранкі, К. М. Міцкевіча, В. А. Сухамлінскага, В. У. Чэчата і інш.

Вызначыць сутнасць і змест патрыятычнага выхавання дапамаглі філасофскія і культуралагічныя працы айчынных і замежных навукоўцаў: Я. М. Бабосава, Г. С. Бацішчава, П. І. Бондара, В. Ф. Гігіна, Я. Д. Грыгаровіч, Э. К. Дарашэвіча, І. У. Канчэўскага, У. М. Конана, І. А. Марзалюка, А. І. Смоліка, М. Ю. Узгорак, Я. С. Яскевіч і інш.

Аналітычны агляд найбольш значных для нашай работы сучасных педагагічных даследаванняў па праблеме патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў тым ліку і па тэорыі, методыцы і арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці выявіў вялікую колькасць навукоўцаў, працы якіх былі прыменяны ў даследаванні з пазіцый розных канцэпцый, метадалагічных падыходаў, праз рэалізацыю педагагічных умоў, мадэлей і сістэм патрыятычнага выхавання (А. Л. Барчук, П. І. Бондар, В. У. Буткевіч, А. Н. Выршчакаў, А.А. Грымаць, М. М. Звёздкін, Н. К. Катовіч, І. В. Катляроў, М. Б. Кусмарцаў, С. Д. Лапцёнак, У. І. Лутавінаў, М. У. Леснічэнка-Рагоўская, В. М. Наумчык, Л. Л. Ражкова, В. У. Чэчат, Р. С. Шчасны, В. Р. Шэфер і інш.).

На аснове аналітычнага агляду літаратуры ў структуры патрыятычнага выхавання вылучаны наступныя кампаненты: эмацыйна-каштоўнасны, кагнітыўны і матывацыйна-дзейнасны.

У сацыякультурным кантэксце ўдакладнено паняццце «патрыятычнае выхаванне навучэнскай моладзі», якое тлумачыцца намі як духоўна-маральная катэгорыя, каштоўнасць асобы, інтэгральнае пачуццё, якое выяўляецца ў вызначанай дзяржаўнай пазіцыі, актыўнай усебаковай дзейнасці на карысць Радзімы, самаахвярнасці, уменні атаясамліваць інтарэсы Радзімы з уласнымі, у адказным стаўленні да сябе, свайго здароўя, сваёй сям'і, сваёй працы, спалучае ў сабе павагу да мовы, культуры, традыцый свайго народа і, як вынік, адлюстоўвае якасную

характарыстыку педагагічнага ўздзеяння на навучэнскую моладзь, што сведчыць аб прыняцці імі адпаведных каштоўнасцей і культуры беларускага народа ў якасці вядучых элементаў асобы.

Агульнанавуковай метадалагічнай асновай дысертацыйнага даследавання выступіў сістэмны падыход, які адлюстроўвае адзінства педагагічнай тэорыі, эксперымента і практыкі (А. М. Авяр'янаў, У. П. Беспалько, І. В. Блаўберг, Ю. А. Канаржэўскі, І. А. Катлярова, Н. В. Кузьміна, С. А. Рэпін, Г. М. Серыкаў, Э. Р. Юдзін і інш.). Асаблівае значэнне ў працы заняў аксіялагічны падыход, які вызначае засваенне (інтэрыярызацыю) навучэнскай моладдзю патрыятычных каштоўнасцей (Я. В. Бандарэўская, М. Вебер, С. А. Долгаў, С. Д. Лапцёнак, Г. Рыкерт, М. Шэлер і інш.). Базавым з'яўляецца культуралагічны падыход, які ў нашым даследаванні прадугледжвае засваенне лепшых узораў беларускай культуры (У. С. Біблер, П. С. Гурэвіч, Я. Д. Грыгаровіч, М. С. Каган, Л. Н. Коган, Н. Б. Крылова, Э. С. Маркаран, С. М. Самтонав, А.І. Смолік, М. Ю. Узгорак і інш.). Патрыятычнае выхаванне вызначаецца дзейнасным падыходам, які яскрава выяўляецца ў актыўнай сацыяльнай пазіцыі навучэнскай моладзі, дзяржаваарыентаваных дзеяннях і ўчынках (Л. С. Выгоцкі, П. Я. Гальперын, В. В. Давыдаў, А. В. Запарожэц, А. М. Лявонцьеў, С. Л. Рубінштэйн і інш.).

*У раздзеле 1.2 «Святочная дзейнасць і яе педагагічны патэнцыял у структуры патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі»* ўдакладняецца спецыфіка арганізацыі патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў клубных установах сродкамі святочнай дзейнасці, вызначаецца яе педагагічны патэнцыял, выяўляюцца ўзроставыя і псіхалагічныя асаблівасці дадзенай сацыяльна-дэмаграфічнай групы.

Узрост, навучэнскай моладзі, задзейнічанай у даследаванні складае 16–17 гадоў. У гэтым узросце істотна змяняецца эмацыйная сфера, якая характарызуецца разнастайнасцю пачуццяў, асабліва маральных і грамадска-палітычных. Да такіх пачуццяў адносяцца любоў да Радзімы, гонар за яе поспехі.

Працы М. М. Бахціна, Д. М. Генкіна, П. А. Гуда, Н. І. Гуд, В. Л. Гуцько, Л. С. Лапцевай, М. Д. Сегала, І. М. Снегірова, Ю. М. Чарняк і інш., прысвечаныя святам і сацыякультурнай актыўнасці ў іх, дазваляюць раскрыць сутнасць і вызначыць педагагічны патэнцыял святочнай дзейнасці.

Свята забяспечвае высокую актыўнасць навучэнскай моладзі ў разнастайных мерапрыемствах, дазваляе самарэалізавацца, раскрыцца і выхаваць патрыёта. Калектыўная арганізацыя святочнай дзейнасці дае магчымасць адчуваць сябе камфортна, свабодна, спрыяе асобаснаму развіццю і фарміраванню патрыятызму. Падчас святочнай дзейнасці навучэнская моладзь праяўляе сябе ў вольнай, нерэгламентаванай форме, што выклікае іх асабістую зацікаўленасць і спрыяе ўсведамленню патрыятычных кашоўнасцей, падтрымлівае адчуванне адзінства.

У святах адлюстроўваецца гістарычнае і духоўнае жыццё грамадства. Многія аспекты і функцыі свята спрыяюць таму, што навучэнская моладзь праз музыку, тэатралізацыю, гульню і іншыя складнікі святочнай дзейнасці самарэалізуецца,

далучаецца да эстэтычных каштоўнасцей, перавыхоўваецца, засвойвае культурныя нормы, родныя звычаі і традыцыі.

*У раздзеле 1.3 «Мадэль патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў клубных установах сродкамі святочнай дзейнасці»* апісваецца аўтарская педагагічная мадэль патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў клубных установах сродкамі святочнай дзейнасці, якая ўяўляе сабой інструмент фарміравання структурных кампанентаў патрыятычнага выхавання, складаецца з арганізацыйна-педагагічных ўмоў і мэтавага, змястоўна-тэхналагічнага, крытэрыяльна-дыягнастычнага, выніковага блокаў (малюнак 1).

Спецыфіка мадэлі заключаецца ў комплекснасці, універсальнасці, варыятыўнасці і паслядоўнасці выкарыстання сродкаў святочнай дзейнасці, калі ўдзельнік самастойна павышае ўзровень сваіх тэарэтычных ведаў аб родным краі, выхоўвае ў сабе любоў і павагу да грамадства, вучыцца шанаваць і захоўваць прыроду, берагчы гісторыка-культурныя каштоўнасці сваёй зямлі, абараняць яе.

Распрацоўка і рэалізацыя мадэлі заснавана на сістэмным, культуралагічным, аксіялагічным, дзейнасным падыходах.

Мэтавы блок структурна-функцыянальнай мадэлі як прагназуемы вынік вызначае арганізацыю, скіраванасць працэсу, яго стратэгічныя і тактычныя мэты і задачы ў адпаведнасці з тэматыкай даследавання.

Змястоўна-тэхналагічны блок змяшчае выкарыстаныя падчас патрыятычнага выхавання прынцыпы святочнай дзейнасці, якія вызначаюць патрабаванні да зместу, метадаў, арганізацыі выхаваўчага працэсу (актыўнасці, вольнага выбару, варыятыўнасці, прывабнасці, эмацыйнага насычэння, пераемнасці, сацыяльнасці, паслядоўнасці, сістэмнасці і інфармацыйнасці, усеагульнасці і самадзейнасці), напрамкі (дзяржаўныя, фальклорныя, гістарычныя, экалагічныя, мастацкія, спартыўныя святы), формы (традыцыйныя і сучасныя, абрады, фестывалі і інш.) і метады (тэатралізацыі, вусны, інфармацыйны, гульнявы і інш.), этапы (падрыхтоўчы, арганізацыйны, асноўны, заключны), якія ствараюць замкнёны цыкл, накіраваны на патрыятычнае выхаванне навучэнскай моладзі. Змест дадзенага працэсу рэалізуецца на аснове інтэграцыі сістэмы ведаў аб гісторыі і культуры роднага краю, традыцыях і рытуалах, якія маюць непасрэднае дачыненне да выхавання патрыятызму.

Крытэрыяльна-дыягнастычны блок адлюстроўваюць крытэрыі, якія адпавядаюць эмацыйна-каштоўнаснаму, кагнітыўнаму і матывацыйна-дзейнаснаму кампанентам структуры патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі, і ўзроўні (высокі, сярэдні, нізкі). Крытэрыі выступаюць як каштоўнасці, якія даюць магчымасць рабіць высновы аб стане і развіцці патрыятычнага выхавання і выяўляюць сябе праз колькасныя і якасныя паказчыкі.

Выніковы блок вызначаецца пераходам ад больш нізкіх узроўняў патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі да больш высокіх.

Вызначаныя блокі распрацаваны згодна з сучаснымі патрабаваннямі педагагічнай навукі, іх зместавае напаўненне ўзаемазвязана, што стварае агульны напрамак, накіраваны на вырашэнне пастаўленых задач і мэты даследавання.




**Малюнак 1 –** Мадэль патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў клубных установах сродкамі святочнай дзейнасці

Паспяховая рэалізацыя педагагічнай мадэлі патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў клубных установах сродкамі святочнай дзейнасці магчыма пры выкананні наступных педагагічных умоў:

*– аб’яднанне навучэнскай моладзі і спецыялістаў сацыяльна-культурнай сферы ў творчую групу па арганізацыі святочнай дзейнасці з улікам узроставa-індывідуальных асаблівасцей першых.* Дадзеная педагагічная ўмова заключаецца ва ўзаемадзеянні паміж навучэнскай моладдзю і спецыялістамі сацыяльна-культурнай сферы, у стварэнні камфортных умоў падчас святочнай дзейнасці, спрыяльнай псіхалагічнай атмасферы, звязана з творчым пошукам і асабістым ростам;

*– стварэнне сацыякультурнага асяроддзя для рэалізацыі навучэнскай моладдзю сваёй суб’ектнай пазіцыі.* У аснове патрыятычнага выхавання павінны ляжаць працэсы заснаваныя на суб’ект-суб’ектных адносінах, якія вызначаюць раўнапраўнае ўзаемадзеянне. Удзельнікі ператвараюцца ў творцаў, адбываецца іх пераход ад аб’екта грамадскіх адносін да суб’екта гэтых адносін, што стымулюе патрыятычнае развіццё асобы, запускае працэсы выхавання і самавыхавання;

*– выкарыстанне метадаў тэатралізацыі, дэманстрацыі, гульні, вуснага, друкаванага і інфармацыйнага ўздзеяння, сучасных і традыцыйных формаў святочнай дзейнасці, накіраваных на павышэнне ўзроўню патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі.* Эмоцыі, якія замацоўваюцца ў працэсе рэпетыцый, непасрэднага правядзення, падрыхтоўкі і ўдзелу ў святах, фарміруюць адносіны навучэнскай моладзі да Радзімы, і чым больш яркае эмацыйнае ўздзеянне свята, тым больш глыбока і ўстойліва фарміруюцца патрыятычныя пачуцці.

*У главе 2 «Шляхі патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў клубных установах сродкамі святочнай дзейнасці»* апісваюцца змест, ход і вынікі эксперыментальнай работы па ўкараненні мадэлі, раскрываецца методыка патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў клубных установах сродкамі святочнай дзейнасці.

*У раздзеле 2.1 «Даследаванне ўзроўня патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі»* прадстаўлены этапы і ход эксперыментальнага даследавання, крытэрыі, узроўні і паказчыкі сфарміраванасці кампанентаў, распрацаваны неабходны інструментарый.

Праграма педагагічнага эксперымента ўключала пілатажнае даследаванне (2015–2017 гг.) на базе дзяржаўнай установы «Дзяржынскі раённы Цэнтр культуры і народнай творчасці» для ўдакладнення задач, метадычнай адпрацоўкі інструментарыя, карэкціроўкі і ўдасканалення мадэлі і методыкі патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў клубных установах сродкамі святочнай дзейнасці. Кантрольную і эксперыментальную групы склала навучэнская моладзь установы адукацыі «Абласны аграрна-тэхнічны ліцэй» (г. Дзяржынск).

У 2015 г. (падчас пілатажнага даследавання) і ў 2021–2022 гг. (падчас асноўнага даследавання) было праведзена даследаванне патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі, вынікі якога спрыялі правядзенню фарміруючага этапу эксперыменту.

На канстатуючым этапе эксперымента фарміраваліся рэпрэзентатыўныя выбаркі і вызначаўся склад удзельнікаў эксперыментальнай і кантрольнай груп, сфарміраваных у 2021 г. на базе дзяржаўнай установы «Палац культуры г. Салігорска» з ліку навучэнскай моладзі ўстановы адукацыі «Салігорскі дзяржаўны каледж» у колькасці 59 навучэнцаў эксперыментальнай і 61 навучэнец кантрольнай груп.

Для ацэнкі і выяўлення ўзроўню патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі былі вызначаны асобныя якасныя і колькасныя характарыстыкі, якія ўяўляюць сукупнасць крытэрыяў (кагнітыўны, эмацыйна-каштоўнасны, матывацыйна-дзейнасны кампаненты) і адпаведных паказчыкаў да іх. Асноўнымі паказчыкамі кагнітыўнага кампанента выступаюць сістэмныя, усвядомленыя веды пра Беларусь; выразныя ўяўленні пра беларускую культуру, святы і традыцыі; дакладнае ўяўленне сутнасці патрыятызму; валоданне беларускай мовай. Асноўнымі паказчыкамі эмацыйна-каштоўнаснага кампанента з’яўляюцца: любоў, гонар за сваю краіну, добрае стаўленне да прыроды, людзей, беларускай культуры, традыцый і святаў; каштоўнасцей, прыярытэтаў, інтарэсаў грамадства і дзяржавы. Асноўнымі паказчыкамі матывацыйна-дзейнаснага кампанента з’яўляюцца: моцная матывацыя, імкненне праз дзеянні і ўчынкі да патрыятычна арыентаванай ініцыятыўнасці, творчай актыўнасці, плённай святочнай дзейнасці.

На аснове крытэрыяў і паказчыкаў кампанентаў патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі былі вылучаны высокі, сярэдні і нізкі ўзроўні. Дыягнастычны замер узроўняў праходзіў з дапамогай спецыяльна распрацаваных інструментаў, да якіх адносяцца анкеты, тэсты, апытальнікі, метад назірання.

Як у эксперыментальнай, так і ў кантрольнай групах пераважае сярэдні ўзровень патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі, аднак асобныя паказчыкі знаходзяцца на нізкім узроўні. Вынікі анкетавання паказваюць, што многія рэспандэнты ўдзельнічаюць ці хацелі б прыняць удзел у святах, а гэта дазваляе меркаваць, што ў працэсе святочнай дзейнасці магчыма значна павысіць эфектыўнасць патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі, укараніўшы адпаведную методыку ў клубныя ўстановы.

*Раздзел 2.2 «Методыка патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў клубных установах сродкамі святочнай дзейнасці»* прысвечаны апісанню фарміруючага эксперымента дысертацыйнага даследавання.

На падрыхтоўчым этапе была арганізавана работа па планаванні, курыраванні, рэсурсным і метадычным забеспячэнні: распрацаваны і праведзены чатыры семінары-практыкумы для спецыялістаў, задзейнічаных у эксперыментальнай рабоце па асноўных пытаннях рэалізацыі методыкі патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў клубных установах сродкамі святочнай дзейнасці.

Рэалізацыя методыкі вызначаецца мэтанакіраваным уключэннем навучэнскай моладзі ў дзеянне свята. Дадзены працэс арыентаваны на фарміраванне патрыятычных пачуццяў падчас знаёмства з гістарычнай, экалагічнай, культурнай, фальклорнай спадчынай беларускай дзяржавы, што садзейнічае росту сацыяльнай

актыўнасці асобы, ініцыяцыі яе творчых патрэб, якія ажыццяўляюцца ў вольны час з улікам жаданняў і інтарэсаў. Удзельнік святочных дзеянняў мае магчымасць праявіць свае арганізатарскія здольнасці, паказаць акцёрскія дадзеныя, удзельнічаць у стварэнні дэкарацый і пошуку касцюмаў.

Распрацаваная методыка патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў клубных установах сродкамі святочнай дзейнасці накіравана на ўдасканаленне эмацыйна-каштоўнаснага (атрыманне новых ураджанняў падчас стварэння і правядзення свята, што спрыяе засваенню патрыятычных каштоўнасцей), кагнітыўнага (укараненне ў змест работы ведаў пра Радзіму) і матывацыйна-дзейнаснага (фарміраванне гатоўнасці да грамадска-карыснай дзейнасці) кампанентаў патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі. У яе аснове – спалучэнне выхаваўчых магчымасцей успрымання і засваення навучэнскай моладдзю вобразаў Радзімы праз святочную дзейнасць, патрыятычныя песні, народныя танцы і г.д. з разуменнем сутнасці патрыятызму, камбінаванне атрыманых патрыятычных ведаў, уменняў і навыкаў з рэкрэатыўнымі момантамі творчага жыцця ўдзельнікаў эксперыментальнага калектыву незалежна ад сацыяльнага статусу.

З мэтай удасканалення кагнітыўнага кампанента патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі прымяняліся розныя сродкі і метады святочнай дзейнасці. Напрыклад, біяграфічны метад, калі перад падрыхтоўкай да свята «Дзень Перамогі» удзельнікам эксперыментальнай групы было прапанавана распавесці пра сваіх прадзедаў, якія ўдзельнічалі ў вайне, падзяліцца ведамі і разуменнем тых падзей, адказаць на пытанне, чым для іх з’яўляецца свята Вялікай Перамогі.

Важная роля ў фарміраванні кагнітыўнага кампанента адводзілася экскурсійнаму метаду. У межах падрыхтоўкі да святаў праводзіліся экскурсіі («Беларускія народныя рамёствы», «17 верасня 1939 года ў лёсе беларускага народа», «Ёсць такая прафесія – абараняць Радзіму», «Купала і Колас – зямлі вялікай галасы»), падчас якіх удзельнікам было прапанавана пазначаць для далейшай працы пэўныя факты, узгаданыя экскурсаводам і занатаваныя ў музейных дакументах, на інфармацыйных стэндах, адлюстраваныя ў разнастайных тэматычных экспазіцыях. Вялікае значэнне для развіцця кагнітыўнага кампанента мела прымяненне метаду сцэнарнага праектавання. Напісанне сцэнарыяў святаў патрабавала ад навучэнскай моладзі пошуку адпаведнай літаратуры і прымянення атрыманых ведаў і заўсёды праходзіла ў форме круглага стала, што спрыяла абмену думкамі.

Важным аспектам для развіцця эмацыйна-каштоўнаснай сферы навучэнскай моладзі з’яўляўся рэпетыцыйны працэс, падчас якога ўдзельнікі эксперыментальнага калектыву развучвалі і спявалі песні, адпаведныя святам, над якімі працавалі, чыталі вершы, выказвалі свае ўражанні.

Патрыятычнае выхаванне навучэнскай моладзі, згодна з нашай методыкай, найбольш актыўна раскрываецца падчас правядзення свята. Святы – падстава яшчэ раз успомніць пра этапы станаўлення і развіцця нашай краіны, адчуць усё хараство родных традыцый, далучыцца да біяграфій патрыётаў, якія жылі, працавалі і перамагалі дзеля Беларусі. Менавіта праз «ажыўленне біяграфій» значных

гістарычных асоб, шляхам тэатралізацыі, музыкі, фотаздымкаў пацвярджаецца і асэнсоўваецца патрыятызм нашых суайчыннікаў: Якуба Коласа, Янкі Купалы, Марата Казея, Уладзіміра Карвата, Васіля Каржа і інш.

Найбольш эфектыўнае развіццё матывацыйна-дзейнаснага кампанента адбываецца падчас увасаблення ўдзельнікамі эксперыментальнай групы святаў. Святочная дзейнасць спараджае матэрыяльны аспект увекавечання ў памяці навучэнскай моладзі важных гістрычных падзей. Напрыклад, падчас удзелу і святкавання «Дня Незалежнасці» навучэнская моладзь усведамляла сваю прыхільнасць ідэалам дзяржавы, патрыятычным каштоўнасцям. Увага да святкавання «Дня Перамогі» з’яўляецца паказчыкам актуальнасці і значнасці свята для сучаснікаў. Свята «Дзень Народнага Адзінства» – гэта духоўны акт гістарычнай памяці. Фальклорныя святы спрыялі больш глыбокаму вывучэнню гісторыі роднага краю, гістарычных месцаў, помнікаў культуры, што ў далейшым забяспечвае духоўнае ўзбагачэнне асобы, выхоўвае грамадзянскую адказнасць за захаванне гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны Радзімы.

На працягу года ўдзельнікі эксперыментальнай групы падключаліся да арганізацыі і правядзення святаў living рознай накіраванасці, далучаліся да гарадскіх святаў у якасці памочнікаў рэжысёра, праводзілі гульні і спаборніцтвы, з’яўляліся сцэнарыстамі, рэжысёрамі, акцёрамі, арганізатарамі, афарміцелямі пры падрыхтоўцы святаў на базе Палаца культуры г. Салігорска. Праведзеная практычная работа даказала, што сродкі святочнай дзейнасці здольны максімальна эфектыўна ўплываць на павышэнне ўзроўню патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі пры іх сістэматычным удзеле ў арганізацыі і правядзенні святаў.

*У раздзеле 2.3 «Вынікі вопытна-эксперыментальнай работы па патрыятычным выхаванні навучэнскай моладзі ў клубных установах сродкамі святочнай дзейнасці»* прадстаўлены асноўныя вынікі апрабацыі аўтарскай мадэлі і методыкі патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў клубных установах сродкамі святочнай дзейнасці.

Аналіз вынікаў ажыццяўляўся праз параўнанне дадзеных, атрыманых падчас канстатуючага і кантрольнага этапаў педагагічнага эксперымента. Эксперыментальная група была ўключана ў святочную дзейнасць, у той час як кантрольная група заставалася ў першапачатковых сацыяльна-культурных умовах.

Для ацэнкі эфектыўнасці працэса апрабацыі мадэлі і методыкі патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі сродкамі святочнай дзейнасці, быў прыменены метад матэматычнай статыстыкі (крытэрый $\chi^2$). Разлікі паказалі, што пасля правядзення кантрольнага этапа значэнне $\chi^2_{эмп}$ стала больш высокім, чым $\chi^2_{крыт}$ ($\chi^2_{эмп} = 9,44 > 5,99 = \chi^2_{крыт}$). Дакладнасць адрозненняў характарыстык параўноўваемых выбарак склала 95 %.

Атрыманыя дадзеныя дазваляюць канстатаваць павышэнне ўзроўню патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ўдзельнікаў эксперыментальнай групы, што відавочна з табліцы 1.

Табліца 1 – Дынаміка ўзроўняў патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў пачатку і пасля фарміруючага эксперымента

| Група | Этап эксперымента | Узровень патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Нізкі | | Сярэдні | | Высокі | |
| | | Колькасць | % | Колькасць | % | Колькасць | % |
| ЭГ | Канстатуючы | 15 | 24 | 33 | 56 | 11 | 20 |
| | Кантрольны | 3 | 5 | 42 | 71 | 14 | 24 |
| КГ | Канстатуючы | 14 | 23 | 35 | 56 | 12 | 21 |
| | Кантрольны | 13 | 20 | 36 | 59 | 12 | 21 |

Адлюстраваныя вынікі сведчыць аб эфектыўнасці апрабацыі мадэлі і методыкі патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў клубных установах сродкамі святочнай дзейнасці, мэтай якой з'яўляецца павышэнне ўзроўню патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Патрыятычнае выхаванне навучэнскай моладзі ўяўляе сабой добраахвотны, калектыўны, мэтанакіраваны, кантралюемы працэс сацыякультурнага педагагічнага ўздзеяння на пачуцці, розум і волю асобы, накіраваны на засваенне, захаванне, развіццё і трансляцыю патрыятычных каштоўнасцей (любоў да Радзімы, павага і абарона Айчыны, веданне нацыянальнай (айчыннай) гісторыі; паважлівыя адносіны да старэйшых, клопат аб малодшых і адказнасць за іх; гатоўнасць да абароны і ўмацавання дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь; паважлівыя адносіны да прадстаўнікоў розных канфесій, нацыянальнасцей, сацыяльных груп; веданне і павага найбольш значных дасягненняў і традыцый нацыянальнай культуры), адлюстроўвае спецыфіку развіцця грамадства і дзяржавы, праяўляецца ў вызначанай дзяржаўнай пазіцыі, працоўнай, адпачынкавай, бытавой і іншых сферах жыццядзейнасці, фарміруе дзяржаваарыентаваную сацыяльна-культурную суб'ектную сутнасць асобы патрыёта.

Па сваёй структуры патрыятычнае выхаванне навучэнскай моладзі – гэта комплекснае ўтварэнне, якое ўзаемазвязана і ўзаемаабумоўлена наступнымі кампанентамі: *эмацыйна-каштоўнасным*, які ўключае пачуцці, эмоцыі, ідэалы, перажыванні, каштоўнасныя арыентацыі, адлюстроўвае стаўленне да Радзімы, навакольнага свету (любоў да Радзімы, роднай прыроды, традыцый, культуры, шанаванне герояў роднага краю, імкненне да абароны гонару Радзімы); *кагнітыўным*, які вызначае авалоданне ведамі патрыятычнага характару (гісторыя роднага краю, культура, традыцыі, святы, разуменне дзяржаўных задач, патрыятычнага абавязку); *матывацыйна-дзейнасным*, які фарміруе матывы, інтарэсы, патрэбы і спалучае кагнітыўны і эмацыйна-каштоўнасны кампаненты ў дзеянні (свядомы і актыўны ўдзел

у рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, абарона інтарэсаў сваёй краіны) [2; 7; 9; 10; 14 – 17; 20].

2. Вызначана, што святочная дзейнасць – гэта від сацыяльна-культурнай актыўнасці чалавека, які праяўляецца ў межах святаў. У выніку чаго ў удзельнікаў выяўляюцца і замацоўваюцца нацыянальныя, культурныя каштоўнасці, раскрываюцца духоўныя, творчыя, камунікатыўныя, арганізатарскія і іншыя здольнасці, увасабляецца дзяржаўная ідэалогія.

*Педагагічны патэнцыял святочнай дзейнасці ў структуры патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі* вызначаецца яе гістарычнай памяццю, асаблівым сацыякультурным асяроддзем, калектыўнай арганізацыяй работы, культурна-духоўнымі магчымасцямі, комплексным падыходам, моцным педагагічным ўздзеяннем на навучэнскую моладзь, адлюстроўвае іх светапогляд, спрыяе актывізацыі сацыяльна-асобасных якасцей, развіццю крэатыўнага мыслення, эмацыйна-вобразнага, пачуццёвага ўспрымання рэчаіснасці, самавызначэнню і самаразвіццю культуратворчай асобы патрыёта ў працэсе арганізацыі і правядзення разнастайных святаў. У структуры патрыятычнага выхавання святочная дзейнасць адлюстроўвае гістарычнае, духоўнае жыццё грамадства, ідэі, інтарэсы і дзеянні на карысць дзяржавы і накіравана на інтэрыярызацыю навучэнскай моладзю патрыятычных каштоўнасцей. [1; 6; 8; 13; 18; 19].

3. Прадстаўленая педагагічная мадэль патрыятычнага выхавання ў клубных установах сродкамі святочнай дзейнасці дазваляе ўдасканаліць напрамак работы па патрыятычным выхаванні з навучэнскай моладдзю. Інструментам патрыятычнага выхавання з'яўляецца святочная дзейнасць, якая актыўна і мэтанакіравана спрыяе выхаванню патрыятычных якасцяў, прадстаўляе шырокія магчымасці навучэнскай моладзі для творчага самавыяўлення, рэалізацыі іх маральных і эстэтычных патрэб. Святочная дзейнасць дае станоўчы эфект пры ўмове сістэматычнага наведвання і ўдзелу навучэнскай моладзі ў арганізацыі і правядзенні святаў розных напрамкаў (дзяржаўных, фальклорных, экалагічных, мастацкіх, спартыўных, гістарычных).

Педагагічная мадэль патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі сродкамі святочнай дзейнасці рэалізуецца праз лагічна звязаныя і ўзаемаабумоўленыя блокі (мэтавы, змястоўна-тэхналагічны, крытэрыяльна-дыягнастычны, выніковы) і этапы (падрыхтоўчы, арганізацыйны, асноўны, заключны (рэфлексіўны)). *Мэтавы блок* вызначае прагназуемы вынік, арганізацыю, скіраванасць працэсу, яго стратэгічныя і тактычныя мэты і задачы ў адпаведнасці з вызначанымі структурнымі кампанентамі патрыятычнага выхавання: кагнітыўным, эмацыйна-каштоўнасным і матывацыйна-дзейнасным. *Змястоўна-тэхналагічны блок* спалучае выкарыстанне прынцыпаў святочнай дзейнасці і патрыятычнага выхавання, напрамкаў, метадаў, этапаў арганізацыі святочнай дзейнасці. Працэс патрыятычнага выхавання забяспечваецца комплексам разнастайных па тэматыцы і форме святаў, якія арганізуюцца навучэнскай моладдзю пад кантролем педагогаў – спецыялістаў сацыяльна-культурнай дзейнасці і ствараюць замкнёны цыкл, накіраваны на развіццё ўсіх кампанентаў патрыятычнага выхавання. *Крытэрыяльна-дыягнастычны блок*

накіраваны на дыягностыку ўзроўню патрыятычнага выхавання ў адпаведнасці з вызначанымі крытэрыямі і паказчыкамі, а таксама на рэфлексію па выніках яе апрабацыі. *Выніковы блок* прадугледжаны для здзяйснення кантролю за атрыманымі вынікамі даследавання на прадмет станоўчай дынамікі росту ўзроўню патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі [3; 5; 21; 22].

4. Падчас вопытна-эксперыментальнай работы пацверджана, што святочная дзейнасць з'яўляецца сродкам праяўлення патрыятызму асобы праз развіццё матываў, патрэб, установак, каштоўнасных арыентацый, інтарэсаў навучэнскай моладзі. Святочная дзейнасць у працэсе разнастайных мерапрыемстваў арганізацыйнага (лекцыі, экскурсіі, адбор літаратурнага матэрыялу і г.д.), асноўнага (распрацоўка сцэнарыяў, арганізацыя рэпетыцыйных заняткаў, спалучэнне разнастайных напрамкаў святочнай дзейнасці) і рэфлексіўнага этапаў далучае да духоўна-маральных каштоўнасцей краіны, яе культурна-гістарычных нормаў, абуджае павагу і любоў да нацыянальных традыцый, фарміруе матывы да дзейнасці на карысць Радзімы, садзейнічае павышэнню эмацыйна-каштоўнаснага, кагнітыўнага, матывацыйна-дзейнаснага кампанентаў патрыятычнага выхавання. Арыгінальнасць методыкі праяўляецца ў яе комплексным характары і паслядоўным педагагічным уздзеянні праз дзяржаўныя, фальклорныя, экалагічныя, гістарычныя, мастацкія, спартыўныя святы, якія паспяхова замацоўваюць патрыятычныя каштоўнасці і культуру беларускага народа. Эфектыўнасці методыкі патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў клубных установах сродкамі святочнай дзейнасці спрыяюць абгрунтаваныя арганізацыйна-педагагічныя ўмовы рэалізацыі гэтага працэсу: аб'яднанне навучэнскай моладзі і спецыялістаў сацыяльна-культурнай сферы ў творчую групу па арганізацыі святочнай дзейнасці з улікам узроства-індывідуальных асаблівасцей першых; стварэнне сацыяльна-культурнага асяроддзя сродкамі святочнай дзейнасці для рэалізацыі навучэнскай моладдзю сваёй суб'ектнай пазіцыі; выкарыстанне метадаў тэатралізацыі, дэманстрацыі, гульні, вуснага, друкаванага і інфармацыйнага ўздзеяння, сучасных і традыцыйных формаў святочнай дзейнасці, накіраваных на павышэнне ўзроўню патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі.

Дыягностыка патрыятычнага выхавання ўдзельнікаў эксперыментальнай і кантрольнай груп і статыстычны аналіз вынікаў праведзенай работы дазволілі ацаніць эфектыўнасць распрацаванай мадэлі і методыкі. Вынікі, атрыманыя падчас фарміруючага эксперымента, дазваляюць прызнаць праведзеную вопытную работу па патрыятычным выхаванні навучэнскай моладзі ў клубных установах сродкамі святочнай дзейнасці дастаткова эфектыўнай [4; 11; 12].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў даследавання**

Асноўныя вынікі даследавання ўкаранёны ў практыку работы Дзяржынскага раённага камітэта грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» (акт ад 02.03.2016); дзяржаўнай установы «Дзяржынскі раённы Цэнтр культуры і народнай творчасці» (акт ад 30.06.2017); дзяржаўнай установы адукацыі «Абласны аграрна-тэхнічны прафесійны ліцэй» (акт ад 30.06.2017); Салігорскага раённага камітэта грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» (акт ад

04.04.2023), установы адукацыі «Салігорскі дзяржаўны каледж» (акт ад 04.04.2023); дзяржаўнай установы «Палац культуры г. Салігорска» (акт ад 04.04.2023).

Матэрыялы даследавання выкарыстоўваюцца ў адукацыйным працэсе ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» пры выкладанні вучэбных дысцыплін «Тэхналогія святочна-абрадавай дзейнасці» для судэнтаў спецыяльнасці 1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць, «Тэхналогія стварэння свята» для судэнтаў спецыяльнасці 1 17 01 05 Рэжысура свят (2 акты ад 15.05.2024).

Атрыманыя вынікі будуць карысныя для спецыялістаў аддзелаў ідэалагічнай работы і па справах моладзі, культуры, спецыялістаў устаноў сацыяльна-культурнай сферы, рэжысёраў свят, педагогаў-арганізатараў дадатковай адукацыі, пры распрацоўцы вучэбных праграм устаноў вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай, прафесійна-тэхнічнай адукацыі, метадычных дапаможнікаў, пры арганізацыі спецыяльных курсаў для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі і слухачоў сістэмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў па пытаннях патрыятычнага выхавання, правядзення і арганізацыі свят.

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА ВУЧОНАЙ СТУПЕНІ

*Артыкулы ў навуковых рэцэнзуемых часопісах*

1. Шык, К. І. Выкарыстанне святочнай дзейнасці ў выхаванні навучэнцаў ва ўстановах клубнага тыпу / К. І. Шык // Сацыяльна-педагагічная работа. – 2012. – № 7. – С. 13–17.

2. Шык, К. І. Патрыятызм як вядучая каштоўнасць асобы, грамадства і дзяржавы / К. І. Шык // Выхаванне і дадатковая адукацыя. – 2013. – № 8. – С. 38–41.

3. Шык, К. І. Скарынаўскія традыцыі – нашчадкам / К. І. Шык // Народная асвета. – 2017. – № 8. – С. 84–87.

4. Шык, К. І. Святочная дзейнасць у сістэме патрыятычнага выхавання навучэнцаў / К. І. Шык // Народная асвета. – 2017. – № 10. – С. 78 – 81.

5. Шык, К. І. Мадэляванне працэсу патрыятычнага выхавання сродкамі святочнай дзейнасці / К. І. Шык // Вышэйшая школа – 2024. – № 2. – С. 27–30.

*Артыкулы ў навуковых зборніках*

6. Шык, К. І. Вольны час і асаблівасці яго выкарыстання навучэнцамі ў сучаснай сацыякультурнай сітуацыі / К. І. Шык // Сучасны культурны працэс: праблемы, перспектывы, метады даследавання : XXXVII навук. канф. студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Мінск, 18 – 19 крас. 2012 г. : зб. навук. арт. / рэдсавет: М. А. Мажэйка (старш.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2012. – С. 237–242.

7. Шык, К. І. Патрыятычнае выхаванне навучэнцаў: паняцце і сутнасць / К. І. Шык // Культура: открытый формат – 2012 : Межд. заоч. науч. конф. : сб. науч. ст. / БГУКИ; редсовет: М. А. Можейко (пред.) [и др.]. – Минск : БГУКИ, 2012. – С. 272–276.

8. Шык, К. І. Роля святаў у жыцці моладзі: аналіз арганізацыі святочнай дзейнасці ў рабоце ўстаноў культуры / К. І. Шык // Культура: открытый формат – 2013 : Межд. заоч. науч. конф. : сб. науч. ст. / БГУКИ; редсовет: В. Р. Языкович (пред.) [и др.]. – Минск : БГУКИ, 2013. – С. 413–417.

9. Шык, К. І. Вопыт выхавання патрыятызму ў заходняй культуры / К. І. Шык // XXXVIII навуковая канферэнцыя студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Мінск 18–19 крас. 2013 : зб. навук. арт. / рэдсавет: В. Р. Языковіч (старш.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2014. – С. 157–161.

10. Шык, К. І. Вопыт выхавання патрыятызму ў краінах СНД (Расіі, Украіне, Казахстане, Узбекістане) / К. І. Шык // Культура: открытый формат – 2014 : Межд. заоч. науч. конф. : сб. науч. ст. / БГУКИ ; редсовет: В. Р. Языкович (пред.) [и др.]. – Минск : БГУКИ, 2014. – С. 414–418.

11. Шык, К. І. Методыка даследавання патрыятычных праяваў навучэнцаў / К. І. Шык // Культура: открытый формат – 2015 : Межд. заоч. науч. конф. : сб. науч.

ст. / БГУКИ ; редсовет: В. Р. Языкович (пред.) [и др.]. – Минск : БГУКИ, 2015. – С. 348–353.

12. Шык, К. I. Тэарэтыка-метадалагічныя асновы патрыятычнага выхавання навучэнцаў сродкамі святочнай дзейнасці / К. І. Шык // Культура: открытый формат – 2016 : Межд. заоч. науч. конф. : сб. науч. ст. / БГУКИ ; редсовет: В. Р. Языкович (пред.) [и др.]. – Минск : БГУКИ, 2017. – С. 512–517.

13. Шык, К. І. Фарміраванне патрыятызму навучэнцаў у выхаваўчай прасторы святочнай дзейнасці / К. І. Шык // Культура: открытый формат : Межд. заоч. науч. конф. (Минск, 24 июня 2021 г.) : сб. науч. ст. / БГУКИ ; редкол. : Е. Е. Корсакова (пред.) [и др.]. – Минск : БГУКИ, 2022. – С. 351–356.

*Матэрыялы навуковых канферэнцый*

14. Шик, К. И. Сущность патриотического воспитания учащейся молодежи и некоторые способы его реализации в Республике Беларусь / К. И. Шик // Проблемы и перспективы развития образования (II) : материалы междунар. заоч. науч. конф., (Пермь, 24 мая 2012 г.). – Пермь : Меркурий, 2012. – С. 110–113.

15. Шик, К. И. Патриотизм в системе ценностных ориентаций учащейся молодёжи / К. И. Шик // Психология и педагогика в системе гуманитарного знания : материалы II Междунар. науч.-практ. конф., Москва, 20–21 марта 2012 г. / под ред. А. Ф. Долматова. – М.: Феникс, 2012. – С. 395–402.

16. Shyk, K. I. Patriotic education: concept and essence / K. I. Shyk // European Science and Technology : materials of the III international research and practice conference, Vol II, Munich, November 1–2, 2012 / publishing office Vela Verlag Waldkraiburg – Munich – Germany, 2012. – P. 443–446.

17. Шык, К. І. Патрыятычныя каштоўнасці ў сістэме выхавання навучэнцаў / К. І. Шык // Общество, культура, личность. Актуальные проблемы социально-гуманитарного знания : материалы III Междунар. науч.-практ. конф., Прага, 5–6 февр. 2013 г. / под ред. И. Г. Дорошиной. – Прага : Социосфера-CZ, 2013. – С. 179–185.

18. Шык, К. І. Роля хрысціянскіх святаў у патрыятычным выхаванні моладзі / К. І. Шык // Христианские ценности в культуре современной молодёжи : материалы II Респ. науч. конф. , Минск 13 дек. 2013 г. / ГУО «Институт теологии имени святых Мефодия и Кирилла» БГУ; ред.-сост.: М. А. Можейко, Е. Ю. Шимбалева. – Минск : Ковчег, 2014. – С. 26–30.

19. Шык, К. І. Роля святаў у жыцці моладзі / К. І. Шык // Навуковы пошук у сферы сучаснай культуры і мастацтва : матэрыялы навуковай канферэнцыі, Мінск, 28 лістапада 2013 г. / Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў; рэдсавет: Ю.П. Бондар (старш.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2014. – С. 414–418.

20. Шык, К. І. Хрысціянскія каштоўнасці ў сістэме патрыятычнага выхавання навучэнцаў / К. І. Шык // Христианство в европейской и мировой истории: сб. докладов XX юбилейных Межд. Кирилло-Мефодиевских чтений, Минск, 24 мая

2014 г. / ред.-сост.: М. А. Можейко, Ю. А. Яроцкая. – Минск : Ковчег, 2015. – С. 124–126.

21. Шык, К. І. Патрыятычнае выхаванне студэнтаў у працэсе выкладання вучэбнай дысцыпліны «Тэхналогія стварэння свята» / К. І. Шык // Проблемы и перспективы развития высшего образования в сфере культуры и искусств : материалы науч.-метод. конф. профессорско-препод. состава учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств», Минск, 3 февр. 2022 г. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств ; редкол.: Н. В. Карчевская [и др.]. – Минск, 2023. – С. 532–536.

*Артыкулы ў навукова-папулярных выданнях*

22. Шык, К. І. Фарміраванне патрыятызму навучэнцаў спецыяльнасці «Зубапратэзная справа» ў выхаваўчай прасторы святочнай дзейнасці / К. І. Шык // Международное общественное объединение зубных техников: (2013-2023): люди, события, документы : сб. ст. / О. В. Молодечкин ; сост. К. И. Шик. – Новополоцк, 2023. – С. 9–16.

# РЭЗЮМЭ

**Шык Кірыл Іванавіч**

## ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ НАВУЧЭНСКАЙ МОЛАДЗІ Ў КЛУБНЫХ УСТАНОВАХ СРОДКАМІ СВЯТОЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

**Ключавыя словы:** патрыятызм, патрыятычнае выхаванне, навучэнская моладзь, святочная дзейнасць, сацыяльна-культурная дзейнасць, клубныя установы, мадэль і методыка патрыятычнага выхавання сродкамі святочнай дзейнасці

**Мэта даследавання:** тэарэтычнае абгрунтаванне, распрацоўка і апрабацыя педагагічнай мадэлі і методыкі патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў клубных установах сродкамі святочнай дзейнасці.

**Метады даследавання:** тэарэтычныя (аналіз, сінтэз, параўнанне, класіфікацыя, мадэляванне), эмпірычныя (назіранне, апытанне, анкетаванне, інтэрв’юіраванне, педагагічны эксперымент), матэматычныя і статыстычныя метады апрацоўкі вынікаў даследавання.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна:** здзейснена комплекснае абгрунтаванне працэсу патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі сродкамі святочнай дзейнасці. У сацыякультурным кантэксце ўдакладнены змест паняцця «патрыятычнае выхаванне навучэнскай моладзі», выяўлены яго сутнасныя характарыстыкі і кампанентная структура; раскрыты сутнасць і педагагічны патэнцыял святочнай дзейнасці як сродку патрыятычнага выхавання ў клубных установах; распрацаваны і эксперыментальна апрабіраваны мадэль і методыка патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў клубных установах сродкамі святочнай дзейнасці; вызначаны арганізацыйна-педагагічныя ўмовы, якія садзейнічаюць эфектыўнай рэалізацыі мадэлі і методыкі патрыятычнага выхавання навучэнскай моладзі ў клубных установах сродкамі святочнай дзейнасці.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні:** вынікі даследавання карысныя для спецыялістаў аддзелаў ідэалагічнай работы і па справах моладзі, культуры, спецыялістаў устаноў сацыяльна-культурнай сферы, рэжысёраў свят, педагогаў-арганізатараў дадатковай адукацыі, пры распрацоўцы вучэбных праграм устаноў вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай, прафесійна-тэхнічнай адукацыі, метадычных дапаможнікаў пры арганізацыі спецыяльных курсаў для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі і слухачоў сістэмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў па пытаннях патрыятычнага выхавання, правядзення і арганізацыі свят.

**Галіна выкарыстання:** сацыяльна-культурная дзейнасць, педагогіка

## РЕЗЮМЕ

**Шик Кирилл Иванович**

## ПАТРИОТИЧЕСКОЕ ВОСПИТАНИЕ УЧАЩЕЙСЯ МОЛОДЕЖИ В КЛУБНЫХ УЧРЕЖДЕНИЯХ СРЕДСТВАМИ ПРАЗДНИЧНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ

**Ключевые слова:** патриотизм, патриотическое воспитание, учащаяся молодежь, праздничная деятельность, социально-культурная деятельность, клубные учреждения, модель и методика патриотического воспитания средствами праздничной деятельности

**Цель исследования:** теоретическое обоснование, разработка и апробация педагогической модели и методики патриотического воспитания учащейся молодежи в клубных учреждениях средствами праздничной деятельности.

**Методы исследования:** теоретические (анализ, синтез, сравнение, классификация, моделирование), эмпирические (наблюдение, опрос, анкетирование, интервьюирование, педагогический эксперимент), математические и статистические методы обработки результатов исследования.

**Полученные результаты и их новизна:** проведено комплексное обоснование процесса патриотического воспитания учащейся молодежи средствами праздничной деятельности. В социокультурном контексте уточнено содержание понятия «патриотическое воспитание учащейся молодежи», выявлены его сущностные характеристики и компонентная структура; раскрыты сущность и педагогический потенциал праздничной деятельности как средства патриотического воспитания в клубных учреждениях; разработаны и экспериментально апробированы модель и методика патриотического воспитания учащейся молодежи в клубных учреждениях средствами праздничной деятельности; определены организационно-педагогические условия, способствующие эффективной реализации модели и методики патриотического воспитания учащейся молодежи в клубных учреждениях средствами праздничной деятельности.

**Рекомендации по использованию:** результаты исследования полезны для специалистов отделов идеологической работы и по делам молодежи, культуры, специалистов учреждений социально-культурной сферы, режиссеров праздников, педагогов-организаторов дополнительного образования, при разработке учебных программ учреждений высшего, среднего специального, профессионально-технического образования, методических пособий при организации специальных курсов для студентов учреждений высшего образования, слушателей системы повышения квалификации и переподготовки кадров по вопросам патриотического воспитания, проведения и организации праздников.

**Область применения:** социально-культурная деятельность, педагогика.

## SUMMARY

**Shyk Kiryl Ivanavich**

## PATRIOTIC EDUCATION OF STUDYING YOUTH IN CLUB INSTITUTIONS THROUGH HOLIDAY ACTIVITIES

**Key words:** patriotism, patriotic education, studying youth, holiday activities, socio-cultural activities, club institutions, models and methods of patriotic education through festive activities

**Purpose of the research:** theoretical foundation, develop, and empirically test a pedagogical model and methodology for patriotic education of studying youth within club institutions, utilizing festive activities.

**Research methods:** тheoretical methods (analysis, synthesis, comparison, classification, modeling), empirical methods (observation, surveys, questionnaires, interviews, pedagogical experiments), mathematical and statistical methods for data processing.

**The obtained results and its novelty:** a comprehensive study of the process of patriotic education of studying youth through festive activities has been conducted. In the socio-cultural context, the content of the concept «patriotic education of studying youth» has been clarified; its essential characteristics and component structure identified. The essence and pedagogical potential of festive activities as a means of patriotic education within club institutions have been revealed. A model and methodology for patriotic education of studying youth in club settings through festive activities have been developed and experimentally tested. Organizational and pedagogical conditions conducive to the effective implementation of this model and methodology have been determined.

**Recommendations for use:** тhe findings are valuable for specialists in ideological work departments and youth affairs, cultural sector professionals, event organizers, educators involved in additional education programs. They can be applied in designing curricula for higher education institutions, vocational colleges, technical schools; in developing methodological manuals for specialized courses for university students; as well as for professionals involved in staff training and retraining concerning patriotic education and the organization of celebrations.

**Field of use:** socio-cultural activities and pedagogy.

*Навуковае выданне*

**ШЫК**
**Кірыл Іванавіч**

**ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ НАВУЧЭНСКАЙ МОЛАДЗІ Ў КЛУБНЫХ УСТАНОВАХ СРОДКАМІ СВЯТОЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ**

Аўтарэферат
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата педагагічных навук
па спецыяльнасці 13.00.05 – тэорыя, методыка і арганізацыя
сацыяльна-культурнай дзейнасці

Падпісана ў друк 08.09.2025. Фармат 60×84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,40. Ул.-выд. арк. 1,56.
Тыраж 60 экз. Заказ 926.

Паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.